ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1987
8
кастрычніка
чацвер

№ 25(1546)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

## БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ ТЭЛЕТАЙП

«УЧОРА · СЁННЯ · ЗАЎТРА»

### ПЛЕНУМ

Маскоўскага райкома Кампартыі Беларусі г. Мінска, які адбудзецца ў кастрычніку, абмяркуе праблемы ідэалагічнай, выхаваўчай работы ў працоўных калектывах і па месцу жыхарства насельніцтва раёна.

Ваша асабістае меркаванне аб цяперашнім узроўні гэтай работы ў калектыве, дзе працуеце, аб стане гандлю і грамадскага харчавання, медыцынскай дапамогі і бытавога абслугоўвання, прапановы ў адрас раённых служб будуць своечасовай дапамогай пры падрыхтоўцы пленума. Вы можаце перадаць свае заўвагі, прапановы ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт», у партком ці накіраваць непасрэдна ў РК КПБ па адрасу: 220036, г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 10. Маскоўскі РК КПБ г. Мінска.

А. САЎЧЫК.

### НА ДНІ ПРАПАГАНДЫСТА

перад кіраўнікамі семінараў сеткі палітычнай асветы выступіў загадчык Мінскага абласнога дома палітасветы Б. А. Путрык. Ён расказаў аб задачах і мэтах перабудовы ў сістэме палітычнай адукацыі ў нашай краіне. Лепшым прапагандыстам універсітэта ўручаны граматы рэктарата і парткома і аб'яўлены падзякі.

Ч. ВІКТАРАЎ.

### ДА 70-ГОДДЗЯ КАСТРЫЧНІКА

кафедра гісторыі КПСС выдала серыю брашур пад рэдакцыяй Т. І. Прытыцкай. Яна ўключае шэсць тэм: «Партыя — правадыр Кастрычніка», «Вялікі Кастрычнік у Беларусі», «Палітыка міру, народжаная Кастрычнікам», «Рэвалюцыя, ` пераўтвараючая свет», «Курсам камуністычнага стварэння», «Кастрычніцкая рэвалюцыя і сучасная ідэалагічная барацьба».

С. ЗДЗЕРАЎ.

### КНІЖНЫ КІЁСК

(размешчаны ў цэнтральным корпусе універсітэта) запрашае студэнтаў і выкладчыкаў набыць неабходныя ім у працы і вучобе навейшыя дапаможнікі, даведнікі: Аношка В. С. Меліяратыўная геаграфія (Мн., Вышэйшая школа); Бянькоўскі В. В., Лойка Л. В. Сусветная сацыялістычная сістэма; Манак Б. А. Методыка эканоміка-геаграфічных даследаванняў; Піржонік І. І. Асновы геаграфіі турызму і экскурсійнага абслугоўвання; Паваляеў С. А. Асновы інфарматыкі; Чартко І. К. Матэматычныя метады ў фізічнай геаграфіі — (Мн., Універсітэцкае).

Т. РУДКОЎСКАЯ.

# Зігзагі прамой лініі

## Я+МЫ=КАЛЕКТЫЎ?









«А ЎСЁ КАНЧАЕЦЦА, канчаецца, канчаецца...» Цягнік рушыў з месца. У яго — расклад, дзе не ўлічваюцца лішнія імгненні на развітанне. Алена, Галка, Света, Саша, Андрэй... Усяго дзевятнаццаць. Дваццатая я. Ім далей — да Мінска.

І ўсё ж на палову хвіліны цягнік затрымаўся, дазволіўшы нам даспяваць песню. За вокнамі шчыра ўсміхаліся, махалі рукамі: «Да пабач-энння!»

— Сябры? — пацікавілася дзяжурная па станцыі.

— Няўжо ж, месяц побач працавалі, далёка ад дому. Пасябравалі,— упэўнена адказала за мяне маці і падштурхнула: «Не чуеш, ці што?»

— Так, — механічна пацвердзіла я, мяркуючы, што іменна ў гэтыя дзве з паловай хвіліны ўпершыню за ўвесь месяц адчула прыхільнасць да кожнага з дзевятнаццаці.

Разлічвала: пісаць пра студэнцкі атрад «Дружба», які працаваў у Германскай Дэмакратычнай Рэспубліцы, будзе лёгка. Таму што лепш адзін раз убачыць, чым сто разоў пачуць. Таму што месяц па берлінскаму часу абяцаў быць насычаным і цікавым. А толькі села за чысты ліст паперы, з'явілася «але». Але як зірнуць на справу збоку, калі сам удзельнічаў у ёй? І як улічыць меркаванне кожнага, хто быў побач з табой? Да таго ж, мары і надзеі нашы не заўсёды спраўджваюцца, і як расцэньваць тое, што рэчаіснасць часам выглядае блякла і нецікава?

### ПАРТРЭТ НА ФОНЕ... ДАЖДЖУ

Я ХВАЛЯВАЛАСЯ. І было чаго. Увесь атрад працаваў два дні. Калі ўлічваць, што сімпатыі і антыпатыі вызначаюцца звычайна з першага позірку, то тэрмін дастатковы для таго, каб паміж людзьмі завязаліся нейкія адносіны. Я ж спазнілася, і знаёмства было яшчэ наперадзе. Потым Люда Піваварчык таксама прызналася: такія думкі не давалі спакою і ёй. Але ўсё абышлося значна лепш. І вось Таццяна Саладкова, якой нас абедзвюх пакінулі на дапамогу, расказвае пра атрад так падрабязна, быццам даўным-даўно ведае кожнага. Мы ўжо не адчуваем сябе чужынцамі.

У вёску Саланое, што знаходзіцца недалёка ад Валожына, мы ехалі не за вялікімі грашыма — каб больш даведацца адзін пра аднаго, пасябраваць і стварыць сапраўдны атрад. Праца, песні пад гітару Алены Румянцавай, апошняя вячэра, якую прыгатавалі па ўласнай ініцыятыве хлопцы... Можна было лічыць, што нам пашанцавала. Таму чакалі і не маглі дачакацца, калі ж сустрэнемся зноў.

Так атрымалася, што побач з намі ў час трэцяга працоўнага заўседы «крочыў» дождж. Гарэзлівы і няўрымслівы забіяка, які паспрабаваў гуляць з намі ў хованкі ў дзень ад'езду, надакучлівы і непатрэбны ў час працы. Таму і прыйшло рашэнне намаляваць партрэт атрада на фоне дажджу.

**Рыса першая. Працоўная.** «Пераможцам у сацыялістычным спаборніцтве паміж брыгадамі стала дэлегацыя з Мінска». Гэтыя словы прагучалі ў канцы змены ў інтэрнацыянальным студэнцкім лагеры «Плотэн». У той вечар у лагеры былі падведзены вынікі работы студэнцкіх атрадаў са Славакіі, ГДР, Грузіі, Арменіі і Беларусі. Хто-небудзь можа палічыць нас самаўпэўненымі, толькі аб перамозе мы ведалі ўжо ў першы дзень працы. Быў ён адным з самых напружаных і цікавых. Калі раней нам даводзілася працаваць у лесе? Ды яшчэ «на саджанцах» — абжыналі сярпамі траву, каб яна не перашкаджала расці маленькім елачкам.

— Праца адказная і даволі складаная,— папярэдзіў нас сам ляснічы і дадаў, што вельмі хвалюецца, ці атрымаецца ўсё адразу. Атрымалася. Махалі сярпамі, пакідаючы за сабой роўныя радкі невялікіх елачак. Да працы прызвычаіліся надзвычай хутка. На экране сацыялістычнага спаборніцтва насупраць назвы нашага атрада ніколі не з'яўлялася лічба ніжэйшая за 100 працэнтаў. Толькі і ў першы, і ў наступныя два дні да першага месца нам было далёка. Сапсаваўся настрой? Так. Адзін на аднаго глядзець не маглі і ўсё спрабавалі знайсці прычыну. Тады і прапанаваў нехта з хлопцаў працаваць па брыгадах. «Навуковая арганізацыя працы»,— жартавалі ў атрадзе. Але жарты жартамі, а прапанова была слушнай, бо праз некалькі дзён на стэндзе ўпершыню за ўсю лагерную змену з'явілася лічба — 217 працэнтаў, і доўгачаканае першае месца зрабілася рэальнасцю. І засталося нашым да канца змены.

Здзіўлялася Габі, студэнтка ляснога тэхнікума, якая працавала разам з намі. Не ведаў, што і падумаць, ляснічы:

— Не разумею, якія ў вас сакрэты! Я каля дваццаці гадоў працую ў лесе. Неаднойчы дапамагалі нам студэнты, але такую выдатную працу бачу ўпершыню. А хлопцы і дзяўчаты з папярэдніх атрадаў таксама нядрэнна працавалі.

(Заканчэнне на 4-й стар.).



# Паралелі, якія збліжаюць

СЕЛЕТНІ сімпозіум, прысвечаны беларуска-балгарскім моўным паралелям, з'яўляецца ўжо пятым у серыі такіх навуковых нарад, пачатых яшчэ ў маі 1976 года у рамках навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж БДУ імя У. І. Леніна і Сафійскім універсітэтам імя Клімента Ахрыдскага. На гэтых сімпозіумах беларускіх і балгарскіх мовазнаўцаў, якія праводзяцца ў Мінску і ў Сафіі, абмяркоўваюцца актуальныя праблемы славянскага мовазнаўства. Гэта, з аднаго боку, агульныя рысы, якія беларуская і балгарская мовы, тэрытарыяльна адцаленыя і не маючыя непасрэдных кантактаў, захавалі яшчэ з часоў старажытнасці, з другога — элементы, што сфарміраваліся ў выніку паралельнага развіцця і стараславянскага ўплыву на беларускую мову і г. д. Гэтыя рысы збліжаюць не толькі нашы мовы, але і нашы народы. Яны аблягчаюць узаемныя зносіны паміж імі, так як і выкарыстанне такога магутнага пасрэдніка ў гэтых зносінах — рускай мовы. Акрамя таго, нашых лінгвістаў цікавяць і тыя адрозненні паміж балгарскай, беларускай і рускай мовамі, якія ўскладняюць узаемнае навучанне мовам. З гэтым звязана, што ў бягучай пяцігодцы сумеснае даследаванне беларускіх і балгарскіх мовазнаўцаў прыняло прыкладны напрамак, накіраваны на аптымізацыю навучання балгарскай мове нашых студэнтаў. Патрэбна адзначыць, што ў дадзеным плане мовазнаўцамі БДУ назапашаны пэўны вопыт: імі складзена ўсесаюзная праграма і выдадзены за апошняе дзесяцігоддзе два падручнікі па балгарскай мове. Балгары ў свой час апублікавалі матэрыялы трох першых сімпозі-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

# Паралелі, якія збліжаюць

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

умаў, прынялі да выдання матэрыялы чацвёртага. Нашы філолагі і выдаўцы будуць рыхтаваць да друку матэрыялы сёлетняга сімпозіума.

Супрацоўніцтва беларускіх і балгарскіх мовазнаўцаў прыносіць карысць: за дзесяць гадоў было апублікавана каля ста работ па сумесных тэмах. Мы спадзяёмся, што і ў далейшым яно будзе плённым. Ва ўмовах перабудовы і інтэнсіфікацыі працоўных намаганняў як у нашай краіне, так і ў НРБ адбываецца актывізацыя развіцця навуковых даследаванняў, рэалізуецца імкненне да іх большай практычнай аддачы. Удзельнікі данага сімпозіума, думаецца, прыкладуць усе свае намаганні ў гэтым напрамку.

На сімпозіуме было зроблена некалькі дакладаў, звязаных з дзейнасцю беларускага першадрукара і асветніка Францыска Скарыны (на папярэднім многія паведамленні прысвячаліся традыцыям вялікага славянскага асветніка, аднаго са стваральнікаў балгарскай і славянскай пісьменнасці Мефодзія). Нас радуе, што балгарскія даследчыкі адгукнуліся на гэту прапанаваную беларусамі тэму. Такім чынам, наш сімпозіум можна лічыць адным з мерапрыемстваў, прысвечаных юбілею беларускага кнігадрукавання.

Але хацелася б падкрэсліць, што сімпозіум праходзіць напярэдадні другой знамянальнай даты — 70-годдзя Вялікага Кастрычніка. Беларускі народ адзначае гэту гадавіну як вялікае нацыянальнае свята. Кастрычнік не толькі абвясціў аб узнікненні новага, сацыялістычнага грамадства, але і садзейнічаў нацыянальнаму адраджэнню многіх нацый і народнасцей нашай краіны, у тым ліку і беларускай нацыі. Многае ў развіцці беларускай нацыянальнай мовы звязана з перамогай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Балгарскі народ адзначае гадавіну Кастрычніка як свята Сацыялізму і Рэвалюцыі. І мы спадзяёмся, што ў развіццё непарушнай і вечнай дружбы паміж савецкім і балгарскім народамі сімпозіум таксама ўнясе свой уклад.

А. ШАРАПА,
прарэктар па міжнародных сувязях.

НА ЗДЫМКАХ: у час работы сімпозіума.





## ВУЧОБА БЕЗ НАВУКІ?

У маі-чэрвені гэтага года навуковым аддзелам камітэта камсамола БДУ імя У. І. Леніна сярод студэнтаў і выкладчыкаў было праведзена анкетаванне з мэтай высвятлення сённяшняга стану студэнцкай навукі, яе нявырашаных праблем, у прыватнасці, паляпшэння дзейнасці савета СНТ як аднаго з адказных звенняў у сістэме навукова-выхаваўчага працэсу ВНУ.

# «Нас выхоўвае тое, што мы аддаём...»

УРАЗІЛІ і прымусілі задумацца адказы на першае пытанне анкеты аб цікавасці сённяшняга пакалення студэнтаў да вучобы і навукі. Пераважная большасць апытаных адказала шчыра — цікавасць зніжаецца.

Што гэта: традыцыйная адгаворка — маўляў, «сёння горш за ўчора» ці канстатацыя рэальнага стану спраў, што патрабуе адпаведных арганізацыйных захадаў? Мяркуючы па пераканаўчасці, з якой адказвалі апытаныя, думаецца, наша сацыялагічнае мерапрыемства зафіксавала вельмі важную тэндэнцыю ў сённяшняй студэнцкай навуцы, што патрабуе, безумоўна, яшчэ і дадатковага вывучэння і прыняцця адпаведных мер.

У прыватнасці, не могуць не непакоіць матывы, якія прыводзіліся ў большасці адказаў (прадстаўнікоў аднолькава як гуманітарных, так і прыродазнаўчых факультэтаў) у «апраўданне» гэтай негатыўнай (былі такія адказы) з'явы, якая, на думку выкладчыкаў, стала сапраўднай напасцю ў асяроддзі сённяшняга навучэнца. Аргумент выстаўляецца такі: маўляў, «высокая навука не прыдасца ў школе, навошта забіваць галовы дзецям звышскладанымі рэчамі, дастаткова ведаў у межах школьнай праграмы, а калі ў чым недасведчаны — на тое ёсць адпаведныя распрацоўкі і дапаможнікі». Аб'ектыўна атрымліваецца, што студэнт з такімі разважаннямі прыходзіць ва універсітэт толькі па дыплом.

А. Макаранка неаднойчы падкрэсліваў: галоўнае, што стварае аўтарытэт настаўніка, — гэта трывалыя і неабмежаваныя шырокія веды. У іх і толькі ў іх — пачатак павагі, гэтай першай любві вучняў да педагога. А што ўжо казаць пра сучасны стан педагагічнай думкі ў школе, якую літаральна рэфармíравалі педагогі-наватары! Чытаеш іх і здзіўляешся: усе яны (В. Ф. Шаталаў, Я. М. Ільін, Ш. А. Аманашвілі і інш.) — сапраўдныя вучоныя ў сваёй галіне. А мы ўсё хочам працаваць па-новаму, творча, як не хочам застою ў сваім педкалектыве, калі ад казёншчыны марнеюць сілы, апускаюцца рукі ў маладога спецыяліста.

І яшчэ адна важная думка, якая міжволі з'яўляецца пры ўважлівым знаёмстве з адказамі на анкету. Прычыны ўсіх недахопаў многія схільны вытлумачваць адсутнасцю матэрыяльных стымулаў ці, ва ўсялякім выпадку, нейкага абавязкова рэальнага заахвочвання. Гэта асабліва выразна прагучала ў адказах прадстаўнікоў тэхнічных факультэтаў.

Безумоўна, матэрыяльная зацікаўленасць павінна мець месца і ў навучальным працэсе ВНУ. У новым «Палажэнні аб падвядзенні вынікаў работы СНТ БДУ імя У. І. Леніна» навуковы аддзел камітэта камсамола рэкамендуе ўвесці ў абавязковую практыку прэміраванне лаўрэатаў саюзных і рэспубліканскіх конкурсаў на лепшую навуковую працу і адпаведна заахвочванне старшынь саветаў СНТ, рэдактараў бюлетэняў-перамоўцаў у сацспаборніцтве паміж факультэтамі. А прызам «сімпатый» мяркуем узнагароджваць аўтара лепшага матэрыялу, што рэкамендуецца да друку ў «Беларускім універсітэце».

Стымул ужо ў тым, каб чалавека пахваліць, сказаць «дзякуй» за добра, натхнёна выкананую справу, даручэнне.

І ўсё ж, аддаючы належнае «практыцызму» нашага часу (сфармулюрем гэта так), ніколі нельга губляць з поля зроку маральны бок праблемы, калі мы хочам выхаваць сапраўдную адказнасць і высокую духоўнасць у чалавеку.

Не выпадкова свой артыкул мы пачалі са слоў Антуана дэ Сент-Экзюперы. У «Пасланні маладым амерыканцам 1942 года» славуты лётчык пісаў: «Не дзеля матэрыяльных выгод любіў я сваю справу, яна ўзбагачала мяне, і ўзбагачала тады і толькі тады, калі я аддаваў больш, чым атрымліваў. Вас фарміруе не тое, што вы атрымліваеце, а тое, што вы аддаяце, і тое, што вы аддаяце грамадству, стварае яго».

І прыемна ўзрадавала, што такую думку выказала большая частка апытаных.

А. ЯСКЕВІЧ,
сакратар СНТ БДУ.

## ЦВЯРОЗАСЦЬ — НОРМА ЖЫЦЦЯ

Наўрад ці хто-небудзь з нас уяўляў да нядаўняга часу шлюб без бакала шампанскага. Напрыклад, у 1980-81 гадах некалькі сотняў студэнтаў адной з медыцынскіх ВНУ на пытанне «У якіх выпадках нельга абысціся без віна?» адказалі: «На шлюбах».

Віно ў свята, віно на дзень нараджэння... Усё гэта трывала ўмацавалася ў нашай свядомасці асацыяцыямі. Звычайна у кожным з гэтых выпадкаў віно выступае як відомы сімвал, як падстава павіншаваць, выказаць падзяку. Віно тут не самамэта, а адна з умоў, атрыбутаў свята.

сіяй, кваліфікацыяй. Аднак у час хваробы яны ўсё болей і часцей пачынаюць выкарыстоўваць працу толькі як крыніцу грошай на гарэлку — іменна гэта становіцца асноўным сэнсам.

Інтарэсы і патрэбнасці сям'і (матэрыяльнае забеспячэнне, выхаванне дзяцей і г. д.) пачынаюць вельмі хутка супярэчыць

хіі матываў прыводзіць да фарміравання замест яе новай іерархіі, дзе імкненне да алкаголю становіцца рашаючым матывам.

Як паказвае псіхалагічны аналіз, калі няма дастаткова моцных інтарэсаў, няма даклада акрэсленых мэт жыцця, а ўсе мэты як бы роўныя, то ў такога чалавека (пры іншых роўных умовах) алкагалізм значна хутчэй стане вядучым матывам і лёгка падпарадкуе сабе астатнія матывы паводзін.

# Алкаголь: вынішчэнне асобы

ПРЫКЛАДНА так, дзякуючы гэтым і некаторым іншым традыцыям, большасць людзей знаёмяцца са своеасаблівым уплывам алкаголю. Спачатку, пакуль чалавек п'е нядаўна і мала, у стане ап'янення даволі лёгка ўзнікае прыўзняты настрой, пачуццё вызвалення ад клопатаў, дабрадушнасць.

З часам, аднак, можа з'явіцца цяга зноў і зноў зведаць гэты прыемны стан, крыніцу якога чалавек пачынае бачыць непасрэдна ў алкаголі. І калі раней змены настрою, якія нясе алкаголь, падманліва ўяўляліся толькі сродкам, дапамагаючым паўней адчуць радасць свята, то цяпер перажыць стан ап'янення становіцца для чалавека важней і прывабней усякай урачыстасці. У выніку з'яўляецца новая, ніколі не існуючая патрэбнасць. Узнікшая патрэбнасць у алкаголі прымушае чалавека ўсё болей уцягвацца ў дзейнасць па яе задавальненню, знаходзіць усё новыя шляхі і сродкі. Гэтая дзейнасць звычайна складаецца з шэрагу дапаможных дзеянняў: знайсці пэўнае акружэнне, набыць грошы, выдумаць падставу для выпіўкі і г. д.




Хваравітая прыхільнасць вядзе да таго, што ўсё болей дзеянняў чалавек пачынае здзяйсняць толькі дзеля задавальнення гэтай патрэбнасці.

З часам, калі хвароба прагрэсіруе, імкненне да алкаголю становіцца асноўным, вядучым матывам паводзін.

З'яўленне новага, вядучага матыву паводзін непазбежна вядзе да большай ці меншай перабудовы ўсёй папярэдняй сістэмы матываў і патрэбнасцей асобы.

Многія да захворвання алкагалізмам былі добрымі спецыялістамі, ганарыліся сваёй прафе-

узрастаючай патрэбнасці ў спіртным. Сям'я ацэньваецца ва ўяўленні захварэўшага як перашкода на шляху задавальнення прыхільнасці. Спачатку ім здаецца, што да іх проста чапляюцца, потым узнікае ўзлаванасць, нарэшце, агрэсіўнасць супраць родных.

Пісьменнік Мікалай Носаў прыводзіць такі прыклад. П'яны бацька прыйшоў дадому. Дома «раздавіў» яшчэ «чацвярцінку». Аднагадовая дачка расплакалася. Ён яе калыхаў, калыхаў — не сумеў суцешыць, дык са злосці кінуў уніз з балкона V паверха.

Паступовае разбурэнне іерар-

Нездарма ўрачы-нарколагі адзначаюць, што людзі, якія маюць «хобі», рэдка аказваюцца ў ліку іх пацыентаў.

Алкаголік дэградуе не толькі сам як асоба. П'янства нясе вялікую маральную і генетычную небяспеку яго дзецям, усёй сям'і, здароўю будучага. Вобразна заўважана, што кожная кропля прынятага бацькамі алкаголю прадвяшчае кроплю тупасці нашчадкам.

Зараз асабліва важна, каб кожны чалавек нашага грамадства, усе мы дакладна асэнсавалі, што дасягненне тых высокіх мэт, якія вызначаны XXVII з'ездам КПСС, рашэнне ключавых задач камуністычнага будаўніцтва, усталяванне прынцыпаў і нормаў сацыялістычнага ладу жыцця, умацаванне маральнага здароўя падрастаючага пакалення немагчыма без рашучых мер барацьбы супраць ужывання алкаголю — аднаго з самых злосных ворагаў на шляху грамадскага прагрэсу.

А. МІРЗАЯН,
студэнт аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта.

# «Ціхія світанкі»

ЦІ НЕ ПРАЎДА— цудоўная назва для піянерскага лагера? Лагера БДУ імя У. І. Леніна. Існуе ён ужо чатыры гады і мае сваіх «старажылаў».

Што прынесла ім лета-87? І турысцкія паходы на Вілейскае водасховішча з начным вогнішчам і добрай песняй да ранку. І спартыўныя сустрэчы з піянерскімі лагерамі «Лясная казка» і «Зенітавец»— нашымі даўнімі сябрамі. І паездкі на возера Нарач у спартыўна-аздараўленчы інтэрнацыянальны лагер універсітэта. І фестываль з байцамі атрада «Дружба»— інтэрлагера БДУ, які размясціўся ў Любані. А як запомнілася свята Нептуна, які са сваёй світай з'явіўся на лодцы-маторцы з самога вострава!

І, зразумела, «Зарніца», якую чакалі некалькі дзён і нават спалі не распранаўшыся, каб устаць па першаму сігналу, але гэты сігнал усё-такі застаў многіх з нас за рознымі справамі. У лагер з'явіліся амаль перад адбоем, бо як жа можна адарвацца ад піянерскага кастра, на якім гатавалася сапраўдная салдацкая каша?!

А колькі радасці прынёс Дзень самастойнасці!

Трэба было бачыць пяты атрад, у які ўвайшлі ўсе выхавацелі, піянерважатыя і адміністрацыя лагера. З піянерскай песняй выходзіў ён на дружынную лінейку, прымаў удзел ва ўсіх мерапрыемствах, а ўвечары быў праведзены КВЗ паміж пятым атрадам і зборнай лагера. Між іншым, мы не толькі весяліліся, але і працавалі гэтак жа выдатна. Два разы ў тыдзень старэйшыя атрады выязджалі ў Вілейку і працавалі там на гароднінасховішчы, за што атрымалі падзяку ад дырэкцыі гархарчгандлю.

На жаль, прыйшоў час развітання. У альбом лагера кожны запісаў самыя лепшыя пажаданні з падзякай і надзеяй на сустрэчу ў будучым. Цікава напісаў Міша Шпілеўскі:

«Быў піянерам,
быў камсамольцам,
Не развітваюся.
Магчыма, прыеду
важатым».

Да пабачэння, «Ціхія світанкі!» Дзякуй за ўвагу, за дабрыню, за новых знаёмых. Сярод тых, хто аддаў цеплыню сваіх сэрцаў дзецям — муж і жонка Л. С. і В. Я. Савічавы, В. Макарчук, А. Мінаева, І. Нагорная, І. Дамашэвіч, А. Лобан, С. Піцуха і многія, многія іншыя.

Э. АНІСЕНКА,
начальнік піянерскага лагера «Ціхія світанкі».

ЗДЫМКІ З ЖЫЦЦЯ ПІЯНЕРАЎ УЗЯТЫ З КАЛЕКЦЫІ АТРАДА.









# Судовая ахова правоў грамадзян



АХОВА правоў і законных інтарэсаў грамадзян — адно з галоўных палітычных, маральных і прававых патрабаванняў сацыялістычнага грамадства. «Савецкая дзяржава, усе яе органы,— запісана ў арт. 4 Канстытуцыі СССР,— дзейнічаюць на аснове сацыялістычнай законнасці, забяспечваюць ахову правапарадку, інтарэсаў грамадства, правоў і свабод грамадзян».

У СССР існуе цэлая сістэма органаў, якія ахоўваюць правы грамадзяніна. Сярод гэтых органаў асобае месца займае суд. Перавага яго у тым, што ён незалежны і падпарадкоўваецца толькі закону. Разбор справы ў судзе адбываецца публічна, пры спаборнасці бакоў. Гэтыя і іншыя дэмакратычныя прынцыпы судаводства ствараюць спрыяльныя ўмовы для высвятлення сапраўдных акалічнасцей справы і выяўлення ісціны, што забяспечвае эфектыўную ахову правоў і законных інтарэсаў грамадзян.

Арт. 58 Канстытуцыі СССР 1977 года даў грамадзянам права ва ўстаноўленым законам парадку абскардзіць у суд дзеянні службовых асоб. У мэтах выканання гэтай канстытуцыйнай нормы на сесіі Вярхоўнага Савета СССР 30 чэрвеня 1987 года прыняты Закон «Аб парадку абскарджання ў суд неправамерных дзеянняў службовых асоб, якія ўшчамляюць правы грамадзян».

Закон і па форме, і па зместу адпавядае духу нашага часу, устаноўкам XXVII з'езда партыі, студзеньскага і чэрвеньскага (1987 г.) Пленумаў ЦК КПСС аб неабходнасці далейшай дэмакратызацыі ўсіх бакоў жыцця савецкага грамадства. Ён павысіў ролю судоў ва ўмацаванні сацыялістычнай законнасці ў сферы адміністрацыйна-прававых адносін.

І да прыняцця гэтага Закона ў суд можна было абскардзіць некаторыя дзеянні службовых асоб (напрыклад, прызнанне несапраўдным ордэр на жылую плошчу, пастанову органаў ДАІ аб пазбаўленні вадзіцельскіх правоў і інш.). У агульнай складанасці судовы кантроль распаўсюджваўся прыкладна на 30 дзеянняў службовых асоб. Пасля ўвядзення з 1 студзеня 1988 г. у дзеянне Закона магчымасці звароту грамадзян у суд са скаргамі на дзеянні службовых асоб значна пашыраюцца.

У Законе не даецца канкрэтнага пераліку дзеянняў службовых асоб, якія можна абскардзіць у суд. Вызначальнай прыкметнай падведамнасці скаргаў суду служыць неправамерны характар дзеянняў службовых асоб, якія абскарджваюцца, ушчамленне правоў грамадзян.

Закон не абмяжоўвае ні кола грамадзян, якія маюць права на скаргу, ні кола службовых асоб, на дзеянні якіх можа быць прынесена скарга ў суд. Па сэнсу Закона абскардзіць у суд можна толькі асабістыя дзеянні службовых асоб. Пры гэтым абскарджаны могуць быць дзеянні, ажыццёўленыя службовымі асобамі як ад свайго імя, так і ад імя прадстаўляемых імі органаў.

Любы грамадзянін мае права звярнуцца ў суд са скаргай, калі лічыць, што службовая асоба зрабіла дзеянні, у выніку якіх:

грамадзянін незаконна пазбаўлены магчымасці цалкам або часткова ажыццявіць права, дадзенае яму законам або іншым нарматыўным актам;

на грамадзяніна незаконна ўскладзены нейкі абавязак.

Не могуць быць абскарджаны ў суд дзеянні службовых асоб, у адносінах якіх дзеючым крымінальна-працэсуальным, грамадзянскім працэсуальным заканадаўствам, заканадаўствам аб адміністрацыйных правапарушэннях і іншым заканадаўствам Саюза ССР і саюзных рэспублік прадугледжаны іншы парадак абскарджання. Акрамя таго, па меркаваннях аховы дзяржаўнай тайны не распаўсюджваецца судовы парадак абскарджання дзеянняў, якія маюць дачыненне да абароны краіны і дзяржаўнай бяспекі.

Да кампетэнцыі суда не адносіцца разгляд скаргаў грамадзян на рашэнні, прынятыя калегіяльным органам (напрыклад, выканкомам мясцовага Савета народных дэпутатаў). Падобныя рашэнні могуць быць апратэставаны, у тым ліку і па скаргах грамадзян, пракурорам па лініі агульнага нагляду.

Вырашэнню скаргі ў судзе павінен абавязкова папярэднічаць разгляд яе вышэйстаячай у парадку падпарадкаванасці службовай асобай або органам.

Іншымі словамі, грамадзянін можа звярнуцца ў суд толькі ў тым выпадку, калі яго скарга не атрымала станоўчага вырашэння ў адміністрацыйным парадку. Гэта павышае адказнасць за прымаемыя рашэнні не толькі службовых асоб, дзеянні якіх непасрэдна абскарджваюцца, але і тых кіраўнікоў, якім гэтыя службовыя асобы падначалены.

Ананімныя заявы да разгляду судамі не прымаюцца.

Па просьбе грамадзян у абарону іх інтарэсаў са скаргамі ў суд могуць звяртацца прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і працоўных калектываў.

Скаргі грамадзян на дзеянні службовых асоб, падаваемыя ў суд, дзяржпошлінай не аплачваюцца.

Скарга падаецца ў раённы (гарадскі) народны суд па месцы работы службовай асобы, чые дзеянні абскарджваюцца.

У суд скарга можа быць пададзена ў месячны тэрмін з дня атрымання грамадзянінам адмовы ў задавальненні яго скаргі вышэйстаячай у парадку падпарадкаванасці службовай асобай ці органамі або з дня заканчэння ўстаноўленага законам тэрміну для разгляду скаргі. Прапушчаны па ўважлівай прычыне тэрмін для падачы скаргі можа быць адноўлены судом.

Пастанова суддзі аб адмове ў прыняцці скаргі можа быць абскарджана ў касацыйным парадку ў вышэйстаячы суд на працягу 10 дзён пасля вынясення пастановы аб гэтым.

Скарга ў народным судзе разглядаецца, як правіла, у адкрытым судовым пасяджэнні з удзелам грамадзяніна, які падаў скаргу, і службовай асобы, дзеянні якой абскарджваюцца. У судовым разглядзе скаргі могуць удзельнічаць прадстаўнікі грамадскасці, а таксама службовыя асобы вышэйстаячых у парадку падпарадкаванасці органаў або іх прадстаўнікі. Няяўка на судовае пасяджэнне бакоў па няўважлівых прычынах не з'яўляецца перашкодай да разгляду скаргі.

Закон устанаўлівае досыць кароткі тэрмін, на працягу якога суд павінен разгледзець скаргу,— 10 дзён.

Суд абавязаны праверыць, адпавядаюць абскарджаныя дзеянні закону ці не. У залежнасці ад вынікаў праверкі суд або прызнае скаргу абгрунтаванай і абавязвае аднавіць парушаныя правы, або адмаўляе ў задавальненні скаргі.

У выпадках звароту ў суд з неабгрунтаванай скаргай судовыя выдаткі па справе могуць быць ускладзены на самога заяўніка.

Выкараняючы самавольства з боку службовых асоб, суды ў той жа час павінны даваць адпор недобрасумленным людзям, якія могуць выкарыстаць дадзенае законам права на скаргу, каб узвесці паклёп на сумленнага работніка. Калі службовая асоба становіцца аб'ектам паклёпу, то, як прадугледжана законам, суд заводзіць крымінальную справу, вінаватыя ў гэтым асобы падлягаюць прыцягненню да крымінальнай адказнасці.

Рашэнне суда не падлягае абскарджанню, але можа быць апратэставана пракурорам у парадку нагляду. Прынясенне пратэсту прыпыняе выкананне рашэння.

Органы або службовыя асобы, якім накіравана для выканання рашэнне суда, абавязаны не пазней чым у месячны тэрмін з моманту вынясення рашэння паведаміць суду аб прынятых мерах. У выпадку невыканання рашэння суд прымае меры, прадугледжаныя законам. А яны вельмі сур'ёзныя. Так, у адпаведнасці з арт. 372 Грамадзянскага працэсуальнага кодэкса БССР суд мае права накласці на вінаватую службовую асобу штраф у размеры да 200 рублёў і назначыць яму новы тэрмін для выканання рашэння. Калі і пасля гэтага службовая асоба не выканае рашэнне, суд можа зноў накладаць на яго штрафы ў размеры да 200 рублёў, але агульная сума штрафу не павінна перавышаць 1000 рублёў. Выплата штрафу не вызваляе службовую асобу ад абавязку выканаць рашэнне суда.

Рэалізацыя правоў грамадзян на абскарджанне ў суд неправамерных дзеянняў службовых асоб будзе садзейнічаць выкараненню бюракратызму і фармалізму ў рабоце дзяржаўнага апарату.

Новы заканадаўчы акт з'яўляецца эфектыўным сродкам, які гарантуе справядлівую абарону правоў і свабод савецкіх грамадзян. У гэтым яго сіла і дэмакратызм.

В. ЦІХІНЯ,
дэкан юрыдычнага факультэта,
доктар юрыдычых навук.

# Зігзагі прамой лініі

Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

Мы толькі пасміхаліся, таму што ведалі: асаблівы сакрэт нашай працавітасці ва ўмелых руках Наташы Варабей і Вольгі Паўловіч, Юры Бацяна і Барыса Папіна, у ведах Сяргея Плыткевіча і кемлівасці Сашы Румака, а таксама ў агульным жаданні перамагчы.

— Я спачатку не ведала, што з нашай сумеснай працы нешта атрымаецца,— усміхаецца Габі (яшчэ б, яна ведала па-руску некалькі слоў, мы па-нямецку — і таго менш).— Зараз разумею, што няма патрэбы ў перакладзе слоў «добра працаваць», калі людзі самі гэтага жадаюць.

Рыса другая. Мастацкая. Існуе ў «Плотэне» такі звычай: кожны атрад выступае са сваёй культурнай праграмай. Такім чынам, за два тыдні мы паспелі ўсе разам навучыцца танцаваць народны армянскі танец і спяваць грузінскія песні. З замілаваннем слухалі выступленне агульнай любіміцы — чэшскі Данкі і з цікавасцю прагледзелі спектакль, падрыхтаваны байцамі нямецкіх студэнцкіх атрадаў. Дзень нашай рэспублікі быў самым апошнім. Вядома, чакаў яго ўвесь лагер. Рыхтавацца да гэтага выступлення байцы атрада пачалі яшчэ задоўга да паездкі ў ГДР. Але разлічвалі мы на іншую аўдыторыю, і тады давялося ў самы апошні момант з улікам поспехаў і няўдач папярэднікаў перакройваць увесь сцэнарый. Патрэбны быў гумар. Які? Вядома, на лагерныя тэмы. Каб зацікавіць гледача. На тэмы студэнцкага жыцця. Каб было зразумела кожнаму. Думалі, спрачаліся ўсім атрадам. Але, мабыць, ні да чаго гэтыя спрэчкі не прывялі б, калі б не ўзяла справу ў свае надзейныя рукі «адказны рэжысёр» Галя Несцярэнка. Назіраючы збоку, адбылося ўсё літаральна ў адзін момант: яшчэ ўвечары сцэнарыя не было, а раніцай камандзір трымаў яго ў руках. Калі зазірнуць глыбей, то не гадзіну і не дзве прасядзелі над ім Галя і Алег Верымейчык, пакуль распісалі кожную дзею, улічылі ўсе дробязі, прадугледзелі ўсе выпадковасці.

...Занавес падняўся ў свой час. Нумары ішлі адзін за другім. У зале апладзіравалі. А за кулісамі кожны праігрываў разам з таварышам яго ролю. Гэта не дзеля прыгожага слова. Я сама чула, як шэптам дапамагала Алена Румянцава спяваць песню пра Беларусь Наташы Варабей і Свеце Балабусе. Бачыла, як хваляваліся за выступаючых Наташа Казлова і камісар Ніна Туромша. Яны працавалі на кухні, рыхтуючы разам з поварам Тарэз традыцыйныя беларускія «дранікі». Асабліва спадабаліся нашым гасцям беларускія народныя песні (а мы пужаліся моўнага бар'еру!), танец «Сударушка» (а ў апошні момант вырашылі выключыць яго з праграмы — хваляваліся, што не атрымаецца), папуры на тэму студэнцкага жыцця, падрыхтаванае Ігарам Ліпкану і Юрам Манюком. Словам, Дзень рэспублікі атрымаўся на славу.



## ЯК РАСТАЎ... АТРАД

Успамінаецца чамусьці адкрыццё лагера, калі «Плотэн» параўноўвалі з авіялайнерам. Два тыдні ляцеў ён прамым курсам: праца, сустрэчы, знаёмствы, дыскатэкі, спартыўныя спаборніцтвы, каб прызямліцца ў дзень падвядзення вынікаў. Заставалася, пералічыўшы ўсе дасягненні: прэмія, атрыманая за першы перыяд працоўнай дзейнасці атрада, памятныя сувеніры і «залаты» серп, што з'явіўся сімвалам нашай працавітасці і, калі хочаце, выключнасці; успомніўшы пра наведванне Трэптаўпарка і Бухенвальда, Дрэздэнскай карціннай галерэі і Музея скарбаў, паездку у Эрфурт і Веймар, дадаўшы падзякі прадстаўнікоў лесанарыхтоўчага прадпрыемства «Вайма» і кіраўніцтва лагера паставіць клічнік ў канцы апавядання пра атрад «Дружба». Так, магчыма, і было б, калі б не атрымалася наступнага невялікага дыялогу:

—Як лічыш, ці сустрэнемся мы ўсе разам, калі прыедзем у Мінск?

— А навошта? Няўжо табе захочацца каго-небудзь з іх убачыць?

Не ведаю, што зрабілі б вы, а я, пачуўшы такое ў адказ, разгубілася. І паспрабавала прааналізаваць, як жылі мы ўвесь гэты месяц, калі ў чалавека нават думкі не з'явілася аб тым, што ў гісторыі атрада можа быць працяг. Звярнулася за дапамогай да байцоў:

«Чаму ты здзіўляешся? Памятаеш, нас атрадам і не называлі ў легеры. Дэлегацыя з Мінска. У час працы атрадам былі, а потым... Ведаеш, калі няма агульнай справы, цяжка заставацца цэлай адзінкай...»

«Нехта хацеў бачыць у гэтай паездцы звычайную турыстычную групу, для якой арганізоўваюць экскурсіі. Іншыя аддавалі перавагу самастойным прагулкам. А ты гаворыш «атрад...»

Можа і дробязі тое, што нехта не выканаў своечасова свае абавязкі, і атрад застаўся без слайдаў пра Беларусь і універсітэт, а іншы забыўся пра касцюмы (абышліся ж!). Магчыма, няцяжка даць тлумачэнне і тады, калі некалькі байцоў атрада не жадаюць ехаць у адным вагоне з іншымі. Нічога не здарылася, калі нават у апошні вечар так і не здзейснілася мара: «А я лічыў: зноў, як раней, песні паспяваем».

Атрад, дзе пад канец не засталося адзінага стрыжня. Ці варта называць яго атрадам?

— Так заўсёды, калі сустракаюцца выпадковыя людзі (няўжо ўсе мы былі выпадковымі ў сваім атрадзе?), калі кожны з іх індывідуаліст і асоба выключная (і таму яго не палохае адзінота?). Я нічога не маю супраць сукупнасці характэрных рыс, якія адрозніваюць якога-небудзь чалавека ад іншых і не збіраюся ствараць студэнцкі атрад, які б увесь час хадзіў у нагу і адказваў хорам. Мне проста балюча чуць: «Няўжо табе хочацца...» Я за імкненне кожнага да выяўлення сваёй асобы, сваёй індывідуальнасці, толькі не тады, калі становіцца гэта самамэтай і нараджае абыякавасць да іншых.

Вельмі ж хацелася, каб, расказваючы пра свой рэкорд — 240 працэнтаў і першае месца, трымаючы ў руках «залаты» серп і здымкі мясцін, якія давялося пабачыць, нехта ўсміхнуўся і ўспомніў яшчэ адну лічбу. Яе няма ні ў справаздачах, ні ў пахвальных граматах — «дваццаць»: «Роўна столькі новых сяброў я знайшоў у атрадзе». Вы не згодны?

М. ЗАГОРСКАЯ.
Фота С. ПЛЫТКЕВІЧА.

# Памочнік — аптымізм

«АПТЫМІСТ»— такую назву нашаму студэнцкаму атраду мы далі не выпадкова. Аптымізм дапамагаў нам пераадольваць цяжкасці ў падрыхтоўчы перыяд, спадарожнічаў у час работы на праполцы капусты і буракоў. З ім мы былі каля начнога вогнішча і ў такія цудоўныя атрадныя святы, як дзень экватара і дзень імянінніка. І хаця лёс свой мы звязалі з дакладнай навукай — прыкладной матэматыкай — гумар, вяселле і смех заўсёды побач з намі. Гэта і дапамагло байцу атрада Таццяне Шумскай стаць для хлопчыкаў і дзяўчынак мясцовага дзіцячага садзіка «добрай цёцяй Таняй».

Надоўга запомніцца байцам фестываль студэнцкіх атрадаў, дзе аптымістамі былі ўсе. Больш за ўсё спадабаўся конкурс на лепшую песню пра занальны штаб. Спадзяваліся, што спецыяльны прыз атрымаем мы, але, на жаль, узнагарода дасталася іншым. Ды мы не расчараваліся: аптымізм дапамог і тут, і наша агітбрыгада выступала з канцэртамі ў мясцовым саўгасе «Гарадок».

«Аптыміст»— гэта не толькі назва. Такія і характары ў нашых дзяўчат. Яны з агеньчыкам працавалі і адпачывалі. Ініцыятарамі атрадных спраў з'яўляліся Аня Бацянькова і Лена Барысенка. Наша гарэнне перадалося і школьнікам Сяргею Самончыку і Лёшу Шумілаву, якія працавалі з намі.

Пасля работы мы дапамаглі добраўпарадкаваць дзіцячы сад у вёсцы Віркава. Байцы адрамантавалі мэблю, пафарбавалі пясочніцы і лаўкі, афармілі пакоі для гульняў.

Як бачыце, цікава жылі. А памочнік ва ўсіх нашых справах — аптымізм.

І. ЛЯПІНА
(СБА «Аптыміст).

# Прыклад для пераймання

Я ВЕТЭРАН ВАЙНЫ і працы. Зразумела, адной цяжка ўпраўляцца з хатняй гаспадаркай. А тут яшчэ як на зло і дах у хляве працякае, і дровы няма каму пасекчы. Ды шмат усялякай іншай работы, з якой жанчыне, асабліва пенсіянерцы, не справіцца.

І вось у мінулым годзе многія мае, здавалася б, невырашальныя праблемы нарэшце пакінулі мяне. А дапамаглі ў гэтым байцы студэнцкага атрада «Рубін» юрыдычнага факультэта БДУ імя У. І. Леніна. Аднесліся да мяне з вялікай павагай. Я бачыла, што яны стамляюцца на рабоце, але вечарам абавязкова прыходзілі, дапамагалі. І дах залаталі, і дровы пасеклі. Знайшлі і шмат іншых спраў. Як яны казалі, дробязей. Але для мяне гэта былі далёка не дробязі. Мне хочацца сказаць шчырае мацярынскае «дзякуй!» Васілю Бойку, Сяргею Тураўцу, Дзмітрыю Гарачку, Рыгору Валчку, Алене Качалоўскай, а таксама ўсім байцам атрада «Рубін».

Дарэчы, часта ўспамінаю іх не толькі я. Добрую памяць пра сябе пакінулі яны і ў кіраўніцтва мясцовага цагельнага завода. Студэнты не толькі выдатна працавалі, але і цудоўна адпачывалі. Выступалі з канцэртамі, арганізоўвалі спартыўныя спаборніцтвы. Карацей, у студэнтаў універсітэта ёсць з каго браць прыклад.

В. КАРАЛЕВА.
ветэран Вялікай
Айчыннай вайны.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВП і імя Я. Коласа.
8 кастрычніка 1987 г.
Зак. 1589.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ. 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

В. а. рэдактара
З. А. АЛЯШКЕВІЧ.